**Н. Галаско**

# ДЗЕЙНАСЦЬ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ НА ЗЭЛЬВЕНШЧЫНЕ

У айчыннай гістарыяграфіі дзейнасць Таварыства беларускай школы (ТБШ) ужо даўно з'яўлялася аб'ектам даследаванняў. Аднак навукоўцы ва ўмовах ідэалагічнага дыктату не маглі ўсебакова прааналізаваць дзейнасць гэтай арганізацыі, разглядаючы ТБШ толькі як «філіял» КПЗБ. Хацелася б разгледзець пастаўленую праблему і з іншага боку. КПЗБ аказвала значны ўплыў на таварыства, але на справе гэта была масавая, народная арганізацыя, якая імкнулася адрадзіць ідэі нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

У гэтым пераконвае дакументальны матэрыял аб дзейнасці ТБШ на заходнебеларускіх землях і на тэрыторыі Зэльвеншчыны. Можна казаць, што таварыства было адной з тых арганізацый, якая імкнулася захаваць беларускую мову, культуру і ідэю нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

На аснове сабранага і вывучанага матэрыялу можна прыйсці да высновы, што ў дзейнасці Таварыства беларускай школы можна вызначыць некалькі этапаў.

Першы этап (1921–1925 гг.) вядомы праз станаўленне арганізацыі з яе культурна-асветніцкай накіраванасцю. На тэрыторыі Зэльвеншчыны ў гэты час гурткоў ТБШ не існавала. Аднак створаныя падпольныя партыйныя і камсамольскія ячэйкі вялі барацьбу за адкрыццё школ і навучанне ў іх на роднай беларускай мове.

Другі этап (1926 – пачатак 1930-х гг.). ТБШ працягвае справу разагнанай Беларускай сялянска-рабочай грамады. Многія аддзелы таварыства ствараюцца ў першую чаргу з палітычнымі мэтамі, але не сціхала і пашыралася культурна-асветніцкая дзейнасць. Польскія ўлады ў гэты час змянілі акцэнт у школьнай палітыцы на карысць больш павольнага тэмпу паланізацыі адукацыі.

На тэрыторыі Зэльвеншчыны былі створаны і дзейнічалі гурткі ТБШ у вёсках Вострава, Пляцянічы,Чырвонае Сяло, Дзешкавічы, Грабава, Дзярэчын, Елка. Шматлікім быў гурток ТБШ у вёсцы Залацеева. Акрамя таго што члены ТБШ вялі барацьбу за беларускую школу, яны адначасова займаліся культурна-асветніцкай дзейнасцю: стваралі бібліятэкі, народныя дамы. Такі народны дом быў пабудаваны і ў в. Вострава. Аднак ужо ў канцы 1920-х гг. пачалося наступленне на беларускія школы і гурткі ТБШ.

Трэці этап ахоплівае 1930-я гг. Нягледзячы на ліквідацыю, закрыццё нацыянальных школ і культурна-асветніцкіх таварыстваў, імкненне беларусаў да набыцця ведаў на роднай мове захавалася і павялічвалася праз розныя даступныя сродкі. Аднак рэалізаваць жаданне мець нацыянальныя школы было магчыма толькі пасля ліквідацыі дзяржаўных меж, якія раздзялілі адзіны беларускі народ і перашкаджалі яго далейшай кансалідацыі.